# Той самы значны дзень

## Выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі чакае рэспубліканскі баль

**Да права прадстаўляць на ім свае рэгіёны найлепшыя ўчарашнія студэнты прайшлі доўгі шлях. Ён быў напоўнены старанай вучобай, валанцёрствам, навуковымі і спартыўнымі дасягненнямі, актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Яны сапраўды заслужылі права быць уганараванымі запрашэннямі на гэтае свята. Наперадзе выпускнікоў чакае новы жыццёвы этап, падчас якога, упэўнены, маладыя людзі праявяць сябе гэтак жа амбіцыйна, крэатыўна, творча, як і падчас сваёй вучобы. З пачаткоўцаў, якія зусім скора ўладкуюцца на першыя працоўныя месцы, вырастуць сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы, таленавітыя кіраўнікі і арганізатары. Гэта ўсё абавязкова будзе! А пакуль... А пакуль гэтым сувязным звяном паміж днём учарашнім і днём заўтрашнім будзе рэспубліканскі баль выпускнікоў ВНУ. Той самы значны дзень у жыцці... Давайце пазнаёмімся з некаторымі ўдзельнікамі свята.**

# «УНІВЕРСІТЭТ — ГЭТА АДУКАЦЫЙНА-ТВОРЧЫ КЛАСТАР»

**У ліку тых, хто будзе прадстаўляць на рэспубліканскім балі выпускнікоў Віцебскую вобласць, — палачанін Мікіта САВЕТНІКАЎ.**



Малады чалавек нарадзіўся ў самым старажытным горадзе Беларусі, а вось дзяцінства і юнацтва правёў у самым маладым — Навапалацку. У 2019 годзе з адзнакай скончыў тут гімназію № 2 і пачаў аналізаваць спецыяльнасці вышэйшых навучальных установ краіны, каб звязаць прафесію з любімымі школьнымі прадметамі — матэматыкай, фізікай, хіміяй. Да апошняй навукі Мікіта цягнуўся больш: ён неаднойчы станавіўся пераможцам гарадскіх і абласных алімпіяд, удзельнічаў і ў рэспубліканскім туры. Свой прафесійны выбар зрабіў у бок спецыяльнасці, якую можна было атрымаць толькі ў адной ВНУ Беларусі — Полацкім дзяржаўным універсітэце імя Е. Полацкай, — «Хімічная тэхналогія прыродных энерганосьбітаў і вугляродных матэрыялаў», якая цяпер называецца «Перапрацоўка нафты і газу і прамысловы арганічны сінтэз».

«Гэтыя чатыры гады былі насычаныя і запамінальныя, менавіта яны загартавалі мяне, выхавалі асобу. Я рады, што акрамя вучобы ў сценах альма-матэр была магчымасць рэалізаваць сябе ў творчасці: асвоіў сферы прамоўніцкага майстэрства, харэаграфіі, КВЗ, нават распрацоўваў бізнес-праект. Разам з гэтым актыўна займаўся навуковай дзейнасцю: удзельнічаў у канферэнцыях, двойчы атрымліваў другую катэгорыю на рэспубліканскім конкурсе навукова-даследчых работ. Сёння ўніверсітэт — адукацыйна-творчы кластар для ўсебаковага развіцця», — адзначае Мікіта.

Пасля атрымання дыплома малады чалавек плануе паступаць у магістратуру, сумяшчаць навуковую дзейнасць з практычным асваеннем спецыяльнасці на нафтахімічным прадпрыемстве. Навіна аб тым, што ён удастоены гонару прадстаўляць ПДУ на рэспубліканскім балі выпускнікоў, вельмі абрадавала юнака, падвяла ўрачыстую рысу пад заканчэннем першай ступені вышэйшай адукацыі. А ўсім абітурыентам, каму неабыякавая хімія і свет палімераў, раіць не раздумваючы абіраць Полацкі дзяржаўны універсітэт імя Е. Полацкай.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**